АРК


# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 1(55) 2008**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**



***Галоўны рэдактар***

**П. Дз. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***

В. В. Бушчык (*нам. галоўнага рэдактара*)
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
А. П. Жытко
М. М. Забаўскі
Л. М. Каранеўская (*адк. сакратар*)
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
Н. І. Кунгурава
А. М. Люты
У. А. Мельнік
А. І. Смолік
С. В. Снапкоўская

Весці БДПУ сер 2. №1 2008


## Змест

### *Гісторыя*


*Сакалоў М.К.* Станаўленне аспіранцкай формы падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў у вышэйшых навучальных установах Беларусі ............ 3

*Пуцік У.С.* Нацыянальнае пытанне ў праграмах і дзейнасці палітычных партый на тэрыторыі Беларусі (на мяжы XIX–XX ст.) ............ 6

*Волкава В.А.* Дзейнасць Маскоўскага і Санкт-Пецярбургскага аддзяленняў Саюза раўнапраўя жанчын у гады Першай расійскай рэвалюцыі ............ 10

*Крывіцкая К.В.* Камісія Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага: стварэнне і склад ............ 13

*Зданкевіч К.В.* Судовая рэформа 1864 г. у Беларусі: гістарыяграфія праблемы ............ 16

*Кадзіра У.М.* Прыгонніцкі ўціск і антыфеадальная барацьба беларускага і ўкраінскага народаў у другой палове XVI – 30-я гг. XVII ст.: аналіз археаграфіі ............ 19

*Люты А.М., Кадзіра У.М.* Генезіс і эвалюцыя казацтва Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV – XVI ст. ............ 21

*Вялікі А.Ф.* Беларуска-польскія ўзаемаадносіны ў знешняй палітыцы СССР у сярэдзіне 40 – другой палове 50-х гг. XX ст. ............ 25

*Важнік В.М.* Эканамічныя, навукова-тэхнічныя і культурныя сувязі БССР і ПНР у 1949–1979 гг. ............ 29

*Гайдукевіч Л.М.* Малыя гістарычныя гарады як аснова развіцця турызму ў рэгіёнах Беларусі ............ 32

*Старычонак В.В.* Месца амерыканскай грамадскай думкі і Кангрэса ЗША ў адносінах да пытання аб прымяненні Злучанымі Штатамі сілы ў 1990–1995 гг. ............ 36

*Субоцін А.Г.* «Імперская рэформа» ў Трэцім рэйху (1933–1934 гг.) ............ 42


### *Філасофія*


*Красюк У.Ф.* Макс Планк на фоне эпохі ............ 46

*Шымбалёў А.А.* Астралогія і рэпрэзентацыя рэальнасці ............ 48

*Стаховіч Т.В.* Эстэтычныя пошукі ў творчасці кампазітара Вячаслава Кузняцова ............ 52


### *Паліталогія*


*Сіманоўскі С.І.* Артыкуляцыя інтарэсаў у палітычнай сістэме грамадства ............ 57

*Скок Н.У.* Палітычная культура: узроўні і структура ............ 61

*Юройць К.П.* Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі канцы XIX – першай чвэрці XX ст. ............ 63

*Новікава С.І.* Развіццё ідэй і ўяўленняў аб праве і справядлівасці: д антычнасці да праектаў сацыялістаў-утапістаў ............ 67


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 930(476+477)«15/136»

*У.М. Кадзіра,*
*выкладчык кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ*

# ПРЫГОННІЦКІ ЎЦІСК І АНТЫФЕАДАЛЬНАЯ БАРАЦЬБА БЕЛАРУСКАГА І ЎКРАІНСКАГА НАРОДАЎ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – 30-я гг. XVII ст.: АНАЛІЗ АРХЕАГРАФІІ

Дэталёвы археаграфічны і крыніцазнаўчы аналіз выданняў дакументаў па гісторыі Беларусі і Украіны другой паловы XVI – 30-х гг. XVII ст. утрымліваецца ў працах А.П. Ігнаценкі [6], З.Ю. Капыскага [16], Н.П. Кавальскага [9] і Н.Н. Улашчыка [23].

Для нашага даследавання вельмі важныя Актавыя кнігі Вялікага княства Літоўскага (1516–1831 гг.) [7] і шэраг прац па прававых пытаннях, выдадзеных у шляхецкай Польшчы і Рэчы Паспалітай у XVI–XVIII стст.

Каштоўнымі крыніцамі для вывучэння кароннага і гарадскога права XVI ст., органаў цэнтральнай і мясцовай адміністрацыі Рэчы Паспалітай, дзейнасць якіх распаўсюджвалася на землі Беларусі і Украіны, з'яўляюцца выдаваемыя ў XVI ст. творы сучаснікаў, грамадскіх і культурных дзеячаў, прысвечаныя рашэнню актуальных пытанняў у галіне юрыспрудэнцыі і спробам удасканалення норм і кадыфікацыі феадальнага права. Да іх ліку адносяцца сістэматызаваныя зборы статутаў, прывілей і канстытуцый, каронных Яна Гербурта «Statuta i przywileje koronne» (1570), Станіслава Сарніцкага «Statuta i metryka przywilejow koronnych» (1594), Яна Янушоўскага «Statuta, prawa i Konstytucje koronne» (1600) [14]. З 1576 г. распаўсюджанне гэтых дакументаў адбывалася з дапамогай тыпаграфнага станка [26].

З другой паловы XIX ст. у Львове пачалі выдавацца серыйныя дакументальныя публікацыі крыніц, пачэрпнутых з мясцовых архівасховішчаў. З 1868 па 1935 г. былі выдадзены 25-томныя «Akta grodzkie i ziemskie z czasow Rzeczypospolitej Polskiej z archiwum t. zw. Bernardynskiego we Lwowie» [10], у якіх утрымліваліся і факты па даследуемай намі праблеме.

Для вывучэння антыфеадальнай барацьбы ў заходняй частцы Галіцкага Прыкарпацця ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. важнымі з'яўляюцца санокскія гарадскія кнігі, апублікаваныя ў асобным зборніку [8] у Львове ў 1891 г.

Цікава, што першымі выданнямі дакументальных крыніц па гісторыі Беларусі і Украіны даследуемага перыяду з'явіліся серыйныя археаграфічныя публікацыі, якія выйшлі ў Маскве і Санкт-Пецярбурзе. Значная роля ў развіцці археаграфіі належала Маскоўскаму архіву Міністэрства замежных спраў (з 1822 г. Маскоўскі архіў Міністэрства замежных спраў (МДАМЗС)). Так, дзякуючы дзейнасці вядомага рускага і ўкраінскага гісторыка Н.Н. Бантыш-Каменскага ў 1813 г. быў выдадзены першы том «Збору дзяржаўных грамат і дагавораў», якія захоўваюцца ў Дзяржаўнай калегіі замежных спраў (ЗДГ і Д), другі і трэці тамы, што выйшлі ў 1819 г. (уключае дакументы за 1329–1612 гг.) і ў 1822 г. (дакументы 1613–1655 гг.), былі выдадзены дзякуючы дзейнасці А.Ф. Маліноўскага і П.М. Строева.

У другім томе ЗДГ і Д меліся дакументы і па даследуемай намі праблеме. Адным з такіх дакументаў была грамата цара Фёдара Іванавіча, выдадзеная прадстаўнікамі Львоўскага Успенскага брацтва ў верасні 1529 г. [20]. Украінскія гісторыкі Г.Ю. Гярбільскі [4] і Н.П. Кавальскі [15] паказалі, што фармальна брацтвы з'яўляліся аб'яднаннямі прыхаджан якой-небудзь царквы, а фактычна былі палітычнымі, эканамічнымі і культурнымі арганізацыямі бюргерства, купцоў і рамеснікаў у барацьбе супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту.

Наступны этап выдання крыніц па гісторыі Беларусі і Украіны другой паловы XVI – 30-х гг. XVII ст. адносіцца да дзейнасці Пецярбургскай Археаграфічнай камісіі, якая выдала: «Акты, якія адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі» ў 5-ці тамах (1846–1853 гг.), «Акты, якія адносяцца да гісторыі Паўднёвай і Заходняй Расіі» ў 15-ці тамах (1861–1892 гг.), «Руская гістарычная бібліятэка» ў 39-ці тамах (1872–1927 гг.) [19].

Агульная характарыстыка серыйных публікацый маецца ў артыкулах В.І. Буганава [21] і Н.Н. Улашчыка [24].

Супрацоўнікі Маскоўскага архіва міністэрства юстыцыі зрабілі спробу выбарачнай публікацыі дакументаў з кніг Літоўскай метрыкі і выдалі ў 1897 г. у Маскве адзіны том «Дакументаў Маскоўскага архіва міністэрства юстыцыі» (Дакументы МАМЮ) з уступным крыніцазнаўчым артыкулам М.В. Доўнар-Запольскага. Асаблівую цікавасць выклікаюць у нас інвентары беларускіх староставаў, замкаў, мястэчак, сёл, валасцей, маёнткаў і двароў у XVI ст. (напрыклад, Брэсцкага староства 1566 г. (№ XVII), Оршы 1560 г. (№ XI), Рэчыцы 1565 г. (№ XIII) і інш.).

Важнейшым цэнтрам па выданні крыніц феадальнай эпохі з 40-х гг. XIX ст. стаў Кіеў. У 1843 г. была заснавана Кіеўская археаграфічная камісія. Першым шматтомным выданнем камісіі з'явіліся «Памятнікі, выдадзеныя часовай камісіяй для разбору старажытных актаў» (ПКК). Своеасаблівасць структуры ПКК заключаецца ў тым, што кожны том раздзяляецца на тры асоб-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

ныя самастойныя часткі, у якіх падабраны крыніцы па пэўнай праблематыцы. Першая частка аб'ядноўвае дакументы ўкраінскіх брацтваў: Луцкага за 1617–1713 гг., Кіеўскага за 1615–1787 гг., Львоўскага, Успенскага, Стаўрапігійскага за 1586–1637 гг. У другой частцы публікаваліся дакументы па гісторыі феадальнага землеўладання і становішча сялянства: у першым томе за 1490–1596 гг., у другім – важныя ўрадавыя дакументы па сацыяльна-эканамічнай гісторыі («Статуты на валокі» за 1557 г. і аб мытах за 1563, 1569, 1573 гг.), у трэцім томе – інвентары феадальных уладанняў за 1566–1598 гг. [2].

Другім і самым буйным выданнем камісіі з'явілася публікацыя «Архіва Паўднёва-Заходняй Расіі» (АПЗР) у 35-ці тамах і 38-мі кнігах. Агульная археаграфічная характарыстыка АПЗР прыведзена ў артыкулах Б.С. Ватулі і Г.Я. Сергіенка [3].

Узнікненне гэтай шматтомнай публікацыі знаходзілася ў прамой сувязі з заснаваннем пры Кіеўскім універсітэце Цэнтральнага архіва, у які паступіла ў сярэдзіне XIX ст. каля 6 тыс. актавых кніг і 0,5 млн асобных дакументаў XVI–XVII стст. [17]. З'яўленне ў распараджэнні камісіі такой вялізнай і яшчэ не ўведзенай у навуковы ўжытак базы крыніц спрыяла змяненню існуючага парадку выдання крыніц розных відаў, пачэрпнутых з розных архіўных фондаў, выданню аднатыпных і аб'яднаных агульнай тэматыкай серыйных выданняў.

Па сваёй тэматыцы АПЗР можна аб'ядназць у некалькі груп, якія былі выдадзены не кампактна, надрукаваны ў разрозненым выглядзе ў розных частках і тамах. Мы выкарысталі дакументы, у якіх былі звесткі пра: 1) сацыяльна-эканамічнае і прававое становішча сялян Беларусі і Украіны; 2) феадальную зямельную ўласнасць; 3) развіццё гарадоў; сацыяльна-эканамічнае і прававое становішча гараджан; 4) антыфеадальную барацьбу сялянства і гарадскога насельніцтва.

Акрамя археаграфічнай камісіі ў Кіеве дзейнічала рэдакцыя гісторыка-літаратурнага і грамадска-палітычнага часопіса «Киевская старина» (1882–1906 гг.), якая выдавала крыніцы па гісторыі XVI–XVII стст. [8].

Важнай крыніцай для вывучэння сацыяльна-эканамічных і палітычных адносін у другой палове XVI – 30-х гг. XVII ст. з'яўляюцца дакументы судовых органаў польска-шляхецкай дзяржавы, якія абаранялі інтарэсы магнатаў і шляхты, гарадскога патрыярхату і з'яўляліся інструментам для падаўлення любых антыфеадальных выступленняў. Да ліку такіх крыніц належаць дакументы польска-літоўскага сейма, сеймавыя канстытуцыі, пастановы і іншыя матэрыялы. У 1899 г. М.Н. Ясінскі выдаў у XIII кнізе «Чытанняў у гістарычным таварыстве Нестара Летапісца» (ЧГТНЛ) 17 дакументаў па гісторыі Луцкага трыбунала за 11 гадоў (1578–1589 гг.), атрыманых з дзвюх Уладзімірскіх і чатырох Луцкіх актавых кніг гарадскога суда [27]. Дзякуючы гэтаму выданню, значна пашырылася кола дакументальных крыніц па гісторыі сацыяльных адносін у даследуемы перыяд.

Яшчэ адным археаграфічным цэнтрам па гісторыі Беларусі і Украіны быў г. Вільнюс, а дакладней Віленская археаграфічная камісія (1864–1915 гг.). Падрабязная характарыстыка яе дзейнасці ўтрымліваецца ва ўжо адзначанай намі манаграфіі па краіцазнаўстве і археаграфіі Н.Н. Улашчыка. Найбольш буйнымі і асноўнымі працамі Віленскай камісіі з'явіліся дзве шматтомныя серыі выдання дакументальных крыніц, сярод якіх знаходзяцца матэрыялы па гісторыі Беларусі і Украіны другой паловы XVI – першай трэці XVII ст.: «Акты, выдаваемыя Віленскай Археаграфічнай камісіяй» у 39-ці тамах (Вільня, 1865–1915 гг.) і «Археаграфічны зборнік дакументаў, якія адносяцца да гісторыі Паўночна-Заходняй Русі, выдаваемы пры ўпраўленні Віленскай навучальнай акругі» (АЗДПЗР) у 14-ці тамах (Вільня, 1867–1904 гг.) [25].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Сярод выданняў Віленскай археаграфічнай камісіі найбольшая колькасць важных дакументаў па гісторыі Беларусі і Украіны другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. утрымліваецца ў 7-м томе АЗДПЗР пад рэдакцыяй П.А. Гільтэбрандта і А.Л. Міратворцава, якія сабралі для дадзенага тома матэрыялы ў Нясвіжскім архіве (Мінская губерня) князёў Радзівілаў. Найбольшы інтарэс выклікаюць эпісталярныя крыніцы па гісторыі сялянска-казацкіх народных рухаў у Беларусі і Украіне канца XVI – першай паловы XVII ст. [11].

Першае археаграфічнае выданне ў савецкі перыяд «Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах» [5] было падрыхтавана ў 1936 г. Д.І. Даўгала, К.І. Кернажыцкім, В.К. Шчарбаковым у г. Мінску. Неабходна адзначыць, што большасць дакументаў і матэрыялаў былі са зборнікаў XVIII–XIX стст.

Значнай з'явай ва ўкраінскай археаграфіі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны было выданне Інстытутам гісторыі Украіны АН УССР у 1941 г. трэцяга тома серыі «Історія України в документах і матеріалах», складзенага Н.Н. Пятроўскім і В.К. Пуцілавым, у якім былі змешчаны крыніцы ад Люблінскай уніі 1569 г. да Пераяслаўскай рады 1654 г. З 206 крыніц, надрукаваных у гэтым томе, 94, гэта значыць амаль палова, асвятлялі падзеі да пачатку вызваленчай вайны ўкраінскага народа [12].

У 1946 г. у Кіеве К.Г. Гуслісты і Н.Н. Пятроўскі выдалі зборнік дакументаў «Україна перед визвольною війною 1648–1654 рр. Збірка документів (1639–1648 рр.)» [22].

Новыя дакументальныя крыніцы, у тым ліку з фондаў Вільнюса, Гродна і Львова, якія не былі даступны да 1939 г., былі ўключаны ў шматтомнае выданне матэрыялаў па гісторыі Беларусі і Украіны другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. [1].

Характэрнымі асаблівасцямі савецкіх археаграфічных выданняў былі: малая колькасць, аднабаковае асвятленне падзей, вузкасць метадалагічнай базы і тэматыкі публікуемых крыніц (сацыяльна-эканамічнае становішча народных мас і іх класавая барацьба), шырокае запазычванне дакументаў і матэрыялаў XVIII–XIX стст.

На жаль, у постсавецкі перыяд працы па археаграфіі (у тым ліку па даследуемым перыядзе) і выданні архіўных крыніц поўнасцю адсутнічаюць, хоць у сховішчах архіваў Масквы, Кіева, Львова, Вільнюса, Мінска, Гродна, Варшавы, Кракава знаходзіцца вялікая колькасць дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі і Украіны феадальнай эпохі.


ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ

1. Белоруссия в эпоху феодализма: сб. док. и материалов. В 3 т. – Минск, 1959–1961.
2. *Ватуля, Б.С.* Из истории археографической практики на Украине в XIX–XX вв. / Б.С. Ватуля // Исторический архив. – 1957. – № 2.
3. *Ватуля, Б.С.* Указ. соч.; *Сергієчко, Г.Я.* «Архив Юго-Западной России» – джерело для вивчення соціально-економічних відносин на Правобережній Україні в другій половині XVII і на початку XVIII ст. НІБ АУ УРСР. – 1959. – № 2 (36).
4. *Гербильский, Г.Ю.* Львов под властью польских феодалов (1387–1772) / Г.Ю. Гербильский // Львов: справочник. – Львов: Вільна Україна, 1949.
5. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. – Мінск, 1936.
6. *Игнатенко, А.П.* Введение в историю БССР: периодизация, источники, историография / А.П. Игнатенко. – Минск: Высш. шк., 1965.
7. *Игнатенко, А.П.* Указ. соч. – С. 13.
8. Історія Української РСР. У 2 т.– Київ: Наукова думка, 1967. – Т. 1; Советская историческая энциклопедия. – М.: Советская энциклопедия, 1965. – Т. 7. – С. 228–229; *Шевцов А.К.* «Вопросы истории феодальных городов Украины» // Киевская старина; Некоторые вопросы социально-экономической и политической истории Украинской ССР. – Днепропетровск: ДГУ, 1973. – Вып. 4. – С. 135–146.
9. *Ковальский, Н.П.* Источниковедение истории Украины (XVI – первой половины XVII века): учеб. пособие. В 4 ч. / Н.П. Ковальский. – Днепропетровск, 1977–1979.
10. *Ковальский, Н.П.* Указ. соч. – Днепропетровск, 1977. – Ч. 1. – С. 24.
11. *Ковальский, Н.П.* Указ. соч. – Днепропетровск, 1978. – Ч. 2. – С. 96.
12. *Ковальский, Н.П.* Указ. соч. – Днепропетровск, 1978. – Ч. 3. – С. 11.
13. *Ковальский, Н.П.* Указ. соч. – Ч. 3. – С. 24.
14. *Ковальский, Н.П.* Указ. соч. – Ч. 3. – С. 29.
15. *Ковальський, М.П.* Львівські братства. Діяльність Івана Фёдорова. Зв'язкі Львова з Росією в XVI – першій половині XVII ст. / М.П. Ковальський // Історія Львова: Короткий нарис. – Львів: Вид-во Львів. ун-ту, 1956. – С. 30.
16. *Копысский, З.Ю.* Сборники документов по истории Белоруссии, изданные в БССР (1921–1971 гг.) / З.Ю. Копысский // Археографический ежегодник за 1974 год. / редкол.: С.О. Шмидт (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1975. – С. 13–23.
17. *Левицкий, О.И.* Пятидесятилетие Киевской комиссии для разбора древних актов. 1843–1893. Исторические заметки о ее деятельности / О.И. Левицкий. – Киев, 1893. – С. 85.
18. Materyaly historyczne. Wydawnictwo towarzy- stwa historycznego we Lwowie. – Lwow, 1891. – T. 1. Regestr zloczyncow grodu Sanocriego 1554–1638.
19. Подробный каталог изданий Археографической комиссии вышедших в свет с 1836 по 1918 г. – 6-е изд. – Петроград, 1918.
20. Собрание государственных грамот и договоров, хранящихся в Государственной коллегии иностранных дел. – М., 1819. – Т. II. – № 61. – С. 124.
21. Советская историческая энциклопедия. – М.: Советская Энциклопедия, 1961. – Т. 1. – С. 318–319.
22. Україна перед визвольною війною 1648–1654 рр. Збірка документів (1939–1648 рр.). – Київ, 1946.
23. *Улащик, Н.Н.* Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н.Н. Улащик. – М.: Наука, 1973. – С. 203–206.
24. *Улащик, Н.Н.* Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н.Н. Улащик. – М.: Наука, 1973. – 303 с.
25. *Улащик, Н.Н.* Указ. соч.
26. *Cytowska, M.* Bibliografia drukow urzedowych XVI wieku / M. Cytowska. – Wroclaw, 1961. – S. 12.
27. *Ясинский, М.Н.* Материалы для истории Луцкого трибунала (1578–1589 гг.) / М.Н. Ясинский // ЧИОНЛ. – Киев, 1899. – Кн. XIII. – Отд. III. – С. 5–34.



SUMMARY

*In his article the author examines the published documentary sources that contain substantial factual material concerning the problem of strengthening social-economic oppression of Belarusian and Ukrainian people and anti-feudal struggle in the second half of XVI*[th] *– in the 30-ies of XVII*[th]*. He also examines various estimations of this problem in the historical literature.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*УДК 947.6(=161.1)«14/15»*


***А.М. Люты,***
*доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі,*
***У.М. Кадзіра,***
*выкладчык кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ*


# ГЕНЕЗІС І ЭВАЛЮЦЫЯ КАЗАЦТВА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XV – XVI ст.

Спрыяльным фактарам актывізацыі антыфеадальнай барацьбы на тэрыторыі Украіны і Беларусі ў XVI ст. з'яўлялася казацтва.

Першыя звесткі пра казацтва датуюцца канцом 30 – пачаткам 90-х гг. XV ст. У хроніцы М. Бельскага апавядаецца, як казакі паказвалі шлях і служылі разведчыкамі польска-літоўскаму войску ў час іх паходу супраць татар [1]. Дзесьці ў 1488 – пачатку 1489 г. кіеўскі ваявода Юрый Пацэвіч у раёне Таванскага перавозу напаў з казакамі на маскоўскі купецкі караван, які вяртаўся з Крыма [2].